

## Ніна Гарагляд

# Кароткія апавяданні

*Гарагляд (Дзякава) Ніна Васільеўна* нарадзілася 20 лютага 1952 года на хутары Паўлінава Пінскага раёна. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Працавала на Брэсцкім тэлебачанні і радыё, настаўнічала на Камянеччыне. З 1974 г. працоўны шлях Н. Гарагляд звязаны з камянецкай раённай газетай «Навіны Камянеччыны»: была літсупрацоўнікам, загадчыцай аддзела пісьмаў і сацыяльных праблем, намеснікам рэдактара, рэдактарам (2003—2008). Выдала некалькі паэтычных кніжак.

## Пасля дажджу

У той летні вечар дождж ліў як з вядра: шчодра, нечакана і, здавалася, бясконца. А парасон Марына на працу не брала. Змокла да ніткі. Доўгая сукенка абвівала ногі, замінала хадзе, а жанчына ж спяшалася: дома чакаў сын.

Муж?.. Муж, напэўна, зноў прывалачэцца п’яны. І хоць вячэра на стале, пачне чапляцца. Будзе крычаць, што ён тут гаспадар, бо кватэра яго, ад маці. І, калі стоміцца, зваліцца на кухні пад стол. Цяжкі, грубы, нялюбы...

У такія вечары ёй хацелася кінуць усё, бразнуць дзвярыма і з’ехаць. Куды вочы глядзяць... У крайнім выпадку — у вёску да маці.

Матуля як у ваду глядзела, калі казала: «Не ідзі за яго, жыткі не будзе. Увесь жа род — горкія п’яніцы». Не паслухала. Гаварыла: «Мой Васіль не такі. Ён мяне любіць. Ён дзеля мяне...»

Дзеля яе ён трымаўся колькі год. А потым з кулакамі стаў кідацца, піў і раўнаваў да кожнага слупа. Ад механіка скаціўся да грузчыка...

Невясёлыя Марыніны думкі перабіў прыемны голас мужчыны:

— Давайце да мяне пад парасон! А то змерзнеце. Хвароба ж нават прыгажунь не шкадуе!

— А калі ваша жонка ўбачыць? — спыталася ў адказ.

— Я сваю яшчэ не сустрэў. Хачу, каб такая, як ты, была. Кветка з правінцыі...

Збянтэжаная Марына адкінула доўгія валасы, мокрым крылом іх незнарок кранула твар незнаёмца.

— Пойдзем да мяне, — як даўняй знаёмай, прапанаваў мужчына. — Дождж перачакаеш. Я ў камандзіроўцы тут.

— Што вы? Я, замужняя, ды па гасцініцах? Яшчэ плёткі пойдуць. Не трэба!

— Пойдзем. Мне сёння стукнула сорак. А побач — ніводнай блізкай душы. Нясу вось бутэльку шампанскага. Не піць жа аднаму? А ты такая мілая. Не крыўдуеш, што я на «ты»?.. Вершы пачытаю: «Последняя любовь прекрасней первой...»

Марына светла заўсміхалася. Ёй са студэнцкай пары ніхто не чытаў вершаў. Ды яшчэ так, каб вочы ў вочы, а душа слухала душу.

Дзве сілы змагаліся ў ёй. Адна, як сатана, шаптала: «Гэта твой чалавек — ідзі! Баішся? Плётак? Ну тады жыві, як жыла, цяжка, будзённа, шэра. Цягні і далей свайго п'яніцу ў рай...»

Мужчына адчуў гэтую няўпэўненасць і працягнуў далонь. Яна схавала рукі за спіну. Але ён знайшоў іх, затрымаў у сваёй.

— Не трэба так. Вы ж мяне зусім не ведаеце, — слаба супраціўлялася Марына.

А руку не забірала, і яна спалоханай птушачкай месцілася ў чужой далоні, і было ёй там так хораша, так цёпленька, што Марына ўжо адчайна вырашыла: хай будзе што будзе. Яна пойдзе з гэтым чалавекам. Пойдзе назло свайму, вечна п'янаму. Хоць раз. Хоць не крыўдна будзе, калі пачне раўнаваць і чапляцца.

...Усё было ў той вечар на дваіх: дажджы, віно, вершы, ціхая размова... Дзень нараджэння быў у мужчыны. Але жанчыне ўсё здавалася наадварот. Ён падарыў ёй свята. Свята, якога яна ніколі не мела. І ўжо не чакала. Свята, якое дало ёй крылы.

— Мне так добра з табой, — ціха шаптала яна. — Толькі я здрадніца. Ты скраў пацалунак...

— Не кажы так, — пярэчыў ён. — Ты самая светлая, самая пяшчотная... Такую на руках насіць буду. Кветка мая запозненая...

Ад гэтых ласкавых слоў яна п'янела, як ад віна. За многія гады ад свайго законнага, калі адкінуць мат, чула толькі «сволач», «зараза», «прынясі», «разуй»... Суцэльнае прыніжэнне і здзек.

...У пад'ездзе дома нехта выкруціў лямпачку. І Марына ніяк не магла знайсці ключ ад кватэры. Дзверы адчыніліся самі: ад іх босымі нагамі зашлёпаў сын. І тут жа п'яна зароў муж:

— Спаць ідзі, заступнічак!

Цяжэнная аплявуха апаліла ёй твар:

— Дзе ты была? — шалёна роў муж.

— Не чапай мяне! Супакойся! — прасіла Марына. Але не тут тое было. Ён парваў на грудзях сукенку, яшчэ раз выцяў па шчацэ і доўга п'яна мацюкаўся.

...Раніцай з люстэрка на яе глянуў свой, але нейкі чужы твар: з падпухлымі ад слёз вачыма, разбітай губой і вялікім сіняком.

Праз плячо вінавата глядзеў муж. Спытаў:

— Ты ж учора з-за дажджу зайшла да сяброўкі? Ты ж ні з кім не была? Праўда?

Душа ў адказ крычала: «Была! Была! З другім! З мужчынам! І гэты мой адзіны вечар значыць для мяне больш, чым усе гады, пражытыя з табой!»

Але ўголас Марына не сказала нічога.

— Я дурань, — вініўся муж. — Вось ні за што зноў ударыў цябе. Прабач, больш не буду. Я кахаю цябе.

Яна не хацела слухаць, як ён яе «кахае». Марына гэта добра ведала. І таму паспешліва пакавала ў дарожную сумку свае і сынавы рэчы. Ноччу яна вырашыла назаўсёды зачыніць за сабой дзверы гэтага абрыдлага дома.

## *Крок насустрач*

Цяпер яна і не памятае, хто з супрацоўнікаў на яе рабочы стол падкінуў гэтую газету. Аднак, калі разгарнула, вочы адразу выхапілі аб'яву. І... зача-

равалі, захвалявалі словы невядомага мужчыны. «Я ведаю, — пісаў чалавек, — што ты на свеце ёсць. Я — твая палавінка... Я шукаю цябе даўно. Адгукніся, адзінокая жанчынка... Няважна, што ў цябе ёсць дзеці. Я стану для іх ласкавым бацькам, а для цябе — сапраўдным мужам, які любіць толькі цябе, і крэпасцю».

Вось гэта апошняе слова ўразіла асабліва. Усё жыццё Галя сама была крэпасцю для свайго мужыка: усё цягнула, усё вырашала. А тут... Шырокія плечы, за якімі надзейна і ўтульна. Сіла... Клопат... А што калі і праўда напісаць незнаёмцу, пасланць фотакартку. Проста так, дзеля цікавасці. Ці здольная яшчэ падабацца?

Пасля вячэры, калі «мужычкі» паселі ля тэлевізара, яна затрымалася на кухні. На чыстым лістку напісала першыя словы: «Дзень добры, далёкая крэпасць! Мне здаецца, што ты зразумееш мяне. Мне сумна! Мне адзінока і так хочацца кахання...»

У кухню зайшоў муж. І яна, як школьніца, прыкрыла ліст далонькай.

— Раман пішаш? — спрабаваў жартаваць ён. — Ну, пішы. А я цябе пачакаю: падушку тваю пагрэю.

Яна з жалем глянула на сутулыя плечы мужа, нязграбную постаць. Старэйшы за яе на восем гадоў, а такі непрактычны ў жыцці. Без жонкі ні кроку. Сам сабе шкарпэткі купіць не можа, у парылку сабрацца... Толькі і чуеш: «Галя, а дзе ляжыць? А як зрабіць? Як скажаш, так і будзе». У выхадны нікуды яго не выцягнеш — ад кніжкі не адарваць. Хіба што ў вёску да бацькоў...

Той, пэўна, не такі... І ёй мроіўся далёкі незнаёмец, шыракаплечы, разваротлівы, вясёлы і, зразумела ж, малады.

Тым больш аднойчы праз дзірачкі паштовай скрынкі яна ўгледзела блакітны канверт, сэрца затахкала, як у дзяўчынкі.

З Бабруйска ён пісаў: «Галечка, ты спадабалася мне на фотцы, ножкі ў цябе прыгожыя, грудкі харошыя. Я хачу, каб ты нарадзіла мне дзіцятка. Грошай у мяне хопіць, каб забяспечыць сям'ю. Але пакуль у мяне няма жылля. Дык будзем жыць на тваёй тэрыторыі...»

Далей яна ўжо не чытала... Спаліла пісьмо ў мужавай попельніцы. Ахапіў страх: на каго патрапіла... І было гідка: нібы аблапаў... Стаяла ў ступары колькі хвілін. Прыдарожны рамонак, абляпаны граззю з-пад калёс...

Не дапамог і душ. І праклінала той дзень, калі з прыдыханнем пісала ліст таму пашляку без тэрыторыі. І цяпер трэба думаць, як адчапіцца ад яго.

Рассцілаючы пасцель на ноч, зноў бэсціла сябе: «Паганка, захацела высокага кахання. Ці ж ад дабра дабро шукаюць? Хто яшчэ так будзе яе кахаць, як клапатлівы, далікатны, пяшчотны муж? Хварэла на кавід, з ног збіваўся: аптэка, магазін, гатоўка, адвозіў сына ў школу, музыкалку. Ці ж ён непрактычны? Ночы не спаў, сядзеў каля яе, рабіў морсы з маліны, парчак і паіў з кубачка. Чула, як у кухні маліўся ўголас перад абразком, каб паправілася, устала. А яна так падвяла мужа. Д'ябал спакусіў... Каб жа той чорт сюды не прыехаў!» Так ёй думалася...

А на другі дзень пасля пісьма той незнаёмец ужо быў у яе гарадку. І Галя ўбачыла сваю «крэпасць». Увечары на кухні яна гатавала галубцы, якія так любяць муж з сынам. У дзверы нехта ціха пастукаў, на парозе з'явіўся мужчына. Зняў заплечнік, паставіў на крэсла. Выдыхнуў: «Ну, добры вечар. Вось я — твая «крэпасць». Будзем жыць разам?»

Галі стала агідна і млосна. Перад ёй, яе ж «распранаючы» нейкімі аблезлымі вачыма, стаяў пажылы чалавек. «Божа, — абварыла думка, — гэтымі доўгімі

рукамі ў наколках ён хацеў абдымаць яе? А яна... Гладзіць гэты старэчы маршчыністы твар? Не!»

— Вам дрэнна? — здзівіўся мужчына. — Я не туды трапіў? Але ж гэта вы, Галя. І тыя ж ножкі, што на картачцы...

— Позна! — залапатала яна. — Я ўжо замужам. Выйшла. Тыдзень назад. Зараз муж з работы вернецца. Ідзіце, адкуль прыйшлі...

Мужчына крыва ўсміхнуўся. Выняў з нагруднай кішэні фотакартку, паклаў на стол.

— Грэх шчасцем жартаваць, маладзіца, грэх...

І выйшаў, моцна ляснуўшы дзвярыма.

Галя перахрысцілася на абразок. З палёгкай уздыхнула. Вось-вось павінен быў вярнуцца з работы муж. Той, што куды вецер дзьме, туды і хіліцца. А хіліцца ўсё ж да яе, да сыночка.

## *Вечарына кахання*

Сама яна ніколі не адважылася б узяць тую пуцёўку ў санаторый. Ды населі, нібы сарокі, сяброўкі, з якімі працавала на будоўлі: «Амаль сорак, а ты ўсё адна і адна... Мо там чалавека добрага сустрэнеш... І будзеш тут з ім хадзіць пад ручкі. Ты ж прыгажуня: хто гляне — той стане. Едзь...»

Угаварылі, «сарокі». Паехала.

Была зіма. У санаторыі ў асноўным адпачывалі пажылыя. Яны толькі і ведалі. што расказваць адно аднаму пра свае балячкі. Сумна... Не раз жанчыне хацелася ўзяць лахі пад пахі — і дадому. Там усё прывычнае, роднае. А тут усе чужыя. Да каго загаварыць і як тыя тыдні перажыць?

Пражыла. Настаў апошні дзянёк гасцявання.

Увечары вырашыла пайсці на танцы. І як здзівілася, калі ўбачыла ў зале яго. Чалавека, вельмі падобнага тварам на аднаго артыста, чый партрэт яна выразала з часопіса і павесіла над сваім ложкам у хаце.

А як зайграла музыка, гэты малады мужчына ўжо ішоў да яе.

Запрашальны жэст — і жаночая ручка белай птушкай апусцілася на плячо незнаёмца. То быў танец-казка, танец-спакуса. Да Верчынай душы ціха падбіралася восень, а ў ягонай — буяла вясна. І гэтым хмелем ён ускружыў ёй галаву. Без сораму шаптаў на вушка ласкавыя словы, і яна верыла тым словам, як наіўная дзяўчынка. Не адпускаў яе ад сябе ўвесь вечар, танцаваў толькі з ёй — і вышэйшага шчасця не было! А пасля танцаў мералі снег у ляску паблізу санаторыя, гулялі ў снежкі, як дзеці... Паклікаў у свой пакой — пайшла... Разам яны і не заўважылі, як ранак злізаў ноч за акном...

А на другі дзень яны развіталіся. Яе адпачынак скончыўся. А мужчына яшчэ заставаўся ў санаторыі. Паабяцаў пазваніць. А яна папрасіла адрасок. Сказала, што часам бывае ў Брэсце і мо заскочыць калі да яго...

А дома толькі і думала пра свайго мужчыну. Што б ні рабіла, куды б ні ішла — усюды ён, ён, ён... Здавалася, што ён і жыве ўжо ў яе хаце... А званка ўсё не было. Гэта прыдушвала. Верка зразумела, што нешта не тое. А тут яшчэ неспадзяванка: адчула, што цяжарная... Ехаць да яго не асмелілася. Дрэнна сябе адчувала. Ды і зіма...

Так прайшло тры месяцы.

А ў адзін цёплы вясновы дзень усё ж вырашыла паехаць да яго. Сказаць, што праз шэсць месяцаў у яе будзе дзіця. Мо гэта зблізіць іх, ён адумаецца, успомніць сваё кароткае каханне...

Адрас дапамог знайсці вуліцу, дом, кватэру. Нясмела пастукала ў дзверы. На парозе, нібы дзяжа, выкацілася грузная кабета. Верка павіталася і спытала:

— Скажыце, тут жыве Сцяпан Рэзнічэнка?

У адказ жанчына злосна прабурчэла:

— З'ехаў пазаўчора цішком той прахвост. Здымаў пакой і за месяц не заплаціў. А ты хто яму будзеш: жонка ці палюбоўніца? Жывот, відаць, ад яго, раз шукаеш...

— А мо вы ведаеце ці чулі, куды ён паехаў? — перабіла Верка жанчыну.

— А адкуль я магу ведаць? — мовіла тая. — Мяне тады і ў хаце не было. Казалі, што з дзеўкай маладой паехаў, прывёз яе з санаторыя... А ты мо і не жонка яму, у летах нейкая...

Але Верка быццам ужо і не чула жанчыну. Стала дрэнна. Закружылася галава. На слабкіх нагах яна ледзь выйшла з пад'езда, што прасмярдзеў кашачай мачой. Паціху дабралася да бліжэйшай лаўкі ў двары. Села, расшпіліла цесны плашч. І на гэты рух дзіця азвалася кароткім штуршком.

На свежым паветры стала адразу лягчэй. Азірнулася вакол. Побач на клумбе някідка цвілі першацветы. Перазімавалі. Па маладой траве хадзіла шпачыха-маці. Вышуквала там семачкі і несла ў дзюбцы сваім птушанятам. А тыя гойсалі каля яе, выпрабоўвалі свае слабыя крыльцы ў невысокім палёце...

І Верцы ўжо памроілася свая дачушка. Ёй, малой, і яна, як тая шпачыха, не з'есць, аддасць лепшы кавалачак. Будзе хадзіць з ёй па магазінах, купляць сукеначкі, вадзіць у садок... І, можа, гэтае позняе дзіця стане ёй апорай у старасці. А бацька? Колькі дзяцей на свеце без бацькі! Вырастаюць, жывуць. Каб толькі людзьмі былі...

Дастала бутэрброд, каб перакусіць, а да лаўкі ўжо падбег сабака. Стаў глядзець на жанчыну мокрымі вачыма. Нічыйны, худы, поўсць зваляная. Пакорпалася ў сумцы, дала і яму бутэрброд. Потым гэты сабака бег за ёю ўсю дарогу да аўтавакзала. Нібы ахоўнік.

А як вярталася дадому, у аўтобусе вадзіцель на ўсю катушку ўключыў прыёмнік. У салон паліліся гукі шлягера: «Не грусти, хорошая, // Что любимым брошена...»

Верка апусціла галаву. Ёй здалося, што песня — пра яе. Даверлівую, грэшную, падманутую. Ці ж не ад таго слязінка салоніць сціснутыя вусны?..